Источник: "Гродзенская праўда" - 2020-04-15

**ІНІЦЫЯТЫВА**

# Ружовы граніт бэзавага саду

## У Каложскім парку да 75-годдзя Вялікай Перамогі ўсталявалі памятны знак – 12-тонны камень

Ён будзе нагадваць гараджанам аб штогадовай акцыі «Бэз Перамогі».

Ружовы граніт больш за два метры ў вышыню «прыехаў» у Гродна з Адэльска. У хуткім часе яго дапоўніць памятная таблічка. Яе вырабам займаюцца спецыялісты Цэнтральнага батанічнага саду НАН Беларусі – адны з арганізатараў маштабнага праекта «Бэз Перамогі» ў Гродне разам з Гродзенскай праваслаўнай епархіяй і ветэранскай арганізацыяй Ленінскага раёна Гродна.

Нагадаем, высаджваць бэз напярэдадні Дня Перамогі стала добрай традыцыяй для горада. Сімвалічная акцыя праходзіла ў Каложскім парку на працягу трох гадоў. Першыя кусты бэзу з'явіліся тут у 2017 годзе, калі абласны цэнтр далучыўся да міжнароднага праекта «Бэз Перамогі».

*– На гэты раз малады бэзавы сад плануем папоўніць яшчэ дваццаццю пяццю саджанцамі. Цяпер тут будзе 100 дрэўцаў. У гэтым годзе добра вядомы многім праект «Бэз Перамогі» атрымае свой працяг у праекце «Бэз Перамогі – сад Міру», які пройдзе ў некалькі этапаў і будзе прымеркаваны да знакавай даты – 100-годдзя з дня Вялікай Перамогі,* – распавёў **намеснік старшыні савета ветэранскай арганізацыі Ленінскага раёна Гродна Уладзімір Куўшынаў.**

Да гэтай круглай даты ўпрыгожваць Каложскі парк будуць каля 250 кустоў бэзу – сапраўдны батанічны сад пад адкрытым небам, які ў пару цвіцення сваім пахам будзе напаўняць увесь парк.

Сімвалічна і тое, што ў гэтым годзе «бэзавы астравок» Каложскага парку дапоўніць сорт са знакавым для горада над Нёманам імем. Навукоўцы Цэнтральнага батанічнага саду НАН Беларусі вывелі сорт у гонар ураджэнца Гродна генерала арміі Аляксея Антонава.

КАЦЯРЫНА МАЦЕВІЧ

Кацярына Мацевіч. Ружовы граніт бэзавага саду